

БЕЛТА

У адным з залаў Нацыянальнай бібліятэкі

# З узростам толькі маладзее...

## Нацыянальная бібліятэка Беларусі стала адной з інфармацыйна насычаных бібліятэк Еўропы

Так, скарбніцы ведаў ужо 90 гадоў. Але галоўнай бібліятэцы краіны гады не перашкода, асабліва пасля таго як яна перасялілася ў новы будынак. “Мы з кожным годам становімся толькі маладзейшымі, — гаворыць дырэктар бібліятэкі Раман Матульскі. — Для таго каб быць запатрабаванымі ў сучасным грамадстве, нельга жыць з тэхналогіямі мінулага і пазамінулага стагоддзяў”. На



Факсімільнае выданне віленскага «Буквара» 1767 года прадстаўляе дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі

думку замежных спецыялістаў, беларускі “алмаз ведаў” з'яўляецца сёння адной з самых прагрэсіўных і інфармацыйна насычаных бібліятэк у Еўропе.

Так, прайшлі тыя часы, калі наяўнасць патрэбнай кнігі бібліятэкар доўга правяраў, капаючыся ў картатэцы. Сёння садзішся за камп'ютар, уводзіш імя аўтара або назву кнігі — і тут жа атрымліваеш усю неабходную інфармацыю. У электронным каталогу Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адлюстроўваюцца не толькі кнігі або перыядычныя выданні, але і дысертацыі, дакументы міжнародных арганізацый, нотныя вы-

данні, аўдыя- і відэадакументы, выяўленчыя дакументы, карты і атласы.

Цяпер, каб атрымаць інфармацыю аб наяўнасці ў фондах бібліятэкі канкрэтнага выдання, падабраць спіс літаратуры па тэме, якая цікавіць, прафесійна скласці бібліяграфічнае апісанне дакументаў, зусім не абавязкова траціць час на дарогу ў бібліятэку. Дастаткова звярнуцца да віртуальнай службы даведак, спецыяльна створанай для аддаленых карыстальнікаў. Тут можна не толькі аб літаратуры даведацца, але і атрымаць кароткую інфармацыю аб канкрэтным факце або падзеі. Запыты прымаюцца штодня на рускай, беларускай і англійскай мовах і выконваюцца на працягу двух рабочых дзён.

А з дапамогай гэтай службы, не выходзячы з дома, можна нават атрымаць лічбавыя копіі дакументаў з фондаў бібліятэкі. Некалькі "клікаў" — і на працягу дня ў вашай электроннай пошце з'явяцца неабходныя раздзелы з кніг, старонкі часопісаў, фрагменты аўдыядакументаў. За паслугу, праўда, прыйдзецца заплаціць. Але расцэнкі, упэўнена, не адпужаюць чытачоў. Мінімальны кошт — 700 рублёў за чорна-белую копію старонкі дакумента з фондаў бібліятэкі. Максімум — 7000 рублёў — за алічбаваную старонку рукапісу XVI стагоддзя.

Пакуль гэта толькі праект, мара і супрацоўнікаў бібліятэкі, і радавых чытачоў. Уласна, электронная бібліятэка "нацыяналкі" цяпер ужо налічвае каля 300 тысяч алічбаваных адзінак. Гэта тыя дакументы, якія не абрамлены правамі інтэлектуальнай уласнасці. "Мы цяпер робім усё магчымае, каб у рамках існуючага прававога поля забяспечыць доступ усіх грамадзян краіны да інфармацыі, у тым ліку і ў электронным выглядзе, — гаворыць Раман Матульскі. — Стварэнне электроннай бібліятэкі Беларусі — работа не аднаго дня і не адной Нацыянальнай бібліятэкі. Наша задача — стварыць дах, пад якім будзе развівацца мноства розных праектаў, што ініцыююцца бібліятэкамі і іншымі ўстановамі па ўсёй краіне".

Гэта калі вы сядзіце ля свайго камп'ютара, папіваючы гарачы чай, і аддалена чытаеце дакументы з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Усяго ў зале тры раздзелы: "Рэсурсы сусветных вытворцаў", "Рэсурсы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі", "Рэсурсы арганізацый-партнёраў". Пазнаёміцца з апошнімі двума можна ў любым месцы, а вось "Рэсурсы сусветных вытворцаў" даступныя толькі з камп'ютараў, размешчаных на тэрыторыі бібліятэк і арганізацый, падпісаных на гэтую паслугу. Затое, не выходзячы з будынка бібліятэкі, вы можаце атрымаць доступ да той інфармацыі, якой штодня карыстаюцца, скажам, студэнты і прафесары з Оксфардскага або Кембрыджскага ўніверсітэта. Нацыянальная бібліятэка забяспечвае доступ прыкладна да 150 баз і банкаў дадзеных усяго свету.

Ларыса **Мінакова**



З 90-годдзем з дня заснавання Нацыянальнай бібліятэкі калектыў гэтай установы павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. "Сёння бібліятэка з'яўляецца захавальніцай унікальнай калекцыі кніг і іншых дакументаў ад старадрукаваных выданняў да найноўшых электронных носьбітаў, буйнейшым інфармацыйным і сацыяльна-культурным цэнтрам краіны, вядучай навукова-даследчай і метадычнай установай у галіне бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства", — гаворыцца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка пажадаў супрацоўнікам і чытачам Нацыянальнай бібліятэкі моцнага здароўя, поспехаў у працы, шчасця і дабрабыту.